ПОЛЫМЯ
Кореличи онлайн!

# «БАСТЫЁНЫ МІРУ»: ГЭТА І ПРА НАС!

**Культурна-спартыўнае свята «Бастыёны Міру» праведзена на базе ДУ «Карэліцкі раённы Цэнтр культуры і народнай творчасці».**

Арганізатары: Беларуская федэрацыя шатакан каратэ-до, Карэліцкі раённы выканаўчы камітэт і Карэліцкі маладзёжны спартыўны клуб «Белы тыгр».

Гасціннасці не пазычаць - у гэтым неаднойчы пераконваліся госці нашага раёна. Сапраўды, карэліччанам гасціннасці не пазычаць, а ў пацвярджэнне таму культурна-спартыўнае мерапрыемства «Бастыёны Міру», у рамках якога прайшлі юнацкія спаборніцтвы па шатакан каратэ-до. Спартсмены з дзесяці клубаў Рэспубліканскай федэрацыі шатакан каратэ-до сустрэліся на татамі, каб паспрачацца ў сумленнай барацьбе.

Месцам правядзення спаборніцтваў стала галоўная сцэна Карэліцкага Цэнтра культуры і народнай творчасці. Госці прыехалі з Віцебскай, Гродзенскай абласцей і г. Мінск. Карэліцкі раён прадставіў маладзёжны спартыўны клуб «Белы тыгр».

















